

**Марк Шагал.** Распяцце Хрыста. Вітраж кафедральнага сабора Нотр-Дам у Рэймсе (фрагмент), Францыя (1974 г.)

2. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах вітражы вокнаў-руж гатычных сабораў Нотр-Дам у Парыжы, Шартры, Руане. Якія матывы і вобразы ў іх выкарыстаны? Як вы думаеце, чаму гэтыя вітражы робяць незабыўнае ўражанне на турыстаў?

3. У 1974 годзе беларускі мастак Марк Шагал прымаў удзел у стварэнні вітражоў кафедральнага сабора Нотр-Дам у Рэймсе ў Францыі. Звярнуўшыся да матываў сярэдневяковага мастацтва, майстар па-свойму раскрыў адзін з эпізодаў Святога Пісання — распяцце Хрыста. Яго вітраж іскрыцца ўсё тымі ж «каштоўнымі» колерамі сярэдневяковага блакіту, рубіну, ізумруду, напаўняючы інтэр'ер храма чароўным свячэннем. Разгледзьце фрагмент вітража «Распяцце Хрыста» М. Шагала. Якія рысы радняць гэты сучасны вітраж з сярэдневяковымі? Што новага прыўнёс майстар?

4. Разгледзьце мініяцюру «Сустрэча караля Шатландыі Роберта Бруса і Эдуарда III» з «Хронік Жана Фруасара». Вызначце статус адлюстраваных асоб. Якія дэталі дапамаглі вам гэта зразумець? Каго з персанажаў мастак паказаў у незвычайнай позе?

### Творчая майстэрня

5. Выберыце любую знамянальную падзею з гісторыі нашай краіны. Складзіце пра гэта некалькі сказаў. На тэму гэтай падзеі афарміце эскіз старонкі рукапісу ў духу Сярэдневякоўя, звяртаючы ўвагу на напісанне літар, ініцыялаў, афармленне палёў (тэхніка і форма прэзентацыі вашай работы — на выбар).

## § 4. Сюжэты і вобразы ў літаратуры, музыцы і тэатры Сярэдневякоўя

Літаратура, музычная і тэатральная культура Сярэдневякоўя, гэтак жа як архітэктура і выяўленчае мастацтва, складаліся ў нетрах антычнай культуры, хрысціянства і фальклору.

**Рыцарскі раман.** Знатных людзей высакароднага паходжання ў эпоху Сярэдневякоўя называлі рыцарамі. Лічылася, што рыцар павінен валодаць пэўнымі якасцямі — мужнасцю, велікадушнасцю, разважлівасцю, адданасцю Прыгожай Даме... Такі своеасаблівы «кодэкс гонару» ўслаўлены ў вершаваных творах — *рыцарскіх раманах*. У гэтым жанры перапляталіся рэалістычныя і фантастычныя сюжэтныя лініі. Здзяйсняючы подзвігі ў імя кахання і гонару, героі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

траплялі ў авантурныя прыгоды. І кожны раз доблесныя і адважныя рыцары дэманстравалі высакароднасць душы і галантнасць у адносінах да жанчыны.

Шырокую вядомасць у гэты перыяд атрымаў цыкл раманаў пра *рыцараў Круглага стала пры двары караля Артура*. У цэнтры сюжэта — жыццё караля Артура і яго падданых, якія стаяць на варце Брытаніі. Падзеі разгортваюцца пры ўдзеле мудрага чараўніка Мэ́рліна і феі Марга́ны, якія дапамагаюць або перашкаджаюць героям. Артуру, каб дапамагчы сваёй краіне, неабходна выцягнуць з каменя чароўны меч Экскалібу́р. Зрабіць гэта здолее толькі чалавек, варты кароны. Седзячы за Круглым сталом, за якім перад каралём усе роўныя, адважныя воіны — «рыцары без страху і папроку» — абмяркоўваюць добрыя справы.



Кароль Артур і яго рыцары Круглага стала. Мініяцюра з гістарычных хронік

Аднак самым папулярным стаў раман пра *вечнае каханне Трыста́на і Ізольды*. Раненага ў баі рыцара Трыстана з дапамогай цудадзейнага зелля вылечвае дачка ворага — Ізольда. Маладыя людзі выпадкова выпіваюць чарадзейны напой, прызначаны для іншай пары, і... вымушаны кахаць адно аднаго ўсё жыццё. Трагічны сюжэт пра закаханых у сярэдневяковай культуры быў успрыняты як гімн шчыраму і ўсёпераможнаму пачуццю кахання, якое не мае перашкод насуперак нягодам і каварству людзей.

...И вот, когда и муж и дева,
Тристан и королева,
Напиток выпили, пришла
И та, кто муки без числа
Вселяет в мир, — пришла Любовь,
Воспламеняющая кровь.
Им был её не слышен шаг,
Но миг — и свой победный стяг
Она в сердцах их водрузила...

*Трыстан і Ізольда*
*(пераклад В. Румера)*

Рыцарскі раман запазычыў у антычнай літаратуры сюжэтныя лініі, вобразы герояў, характары. Падумайце, якія антычныя міфы нагадваюць сюжэты рыцарскіх раманаў пра караля Артура, Трыстана і Ізольду. Фрагменты тэкстаў прачытайце на дадатковай старонцы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Музычныя алегорыі.** Музычным сімвалам Сярэдневякоўя стаў *грыгарыя́нскі хара́л* — песнапенне, якое выконваецца ў царкве. Сваю назву гэты від царкоўнай музыкі атрымаў у гонар Папы Рымскага Грыгорыя І, які сабраў шматлікія песнапенні ў адзіны зборнік.



Няўменны запіс

Грыгарыянскі харал складана ўспрымаць як закончаны музычны твор. Гэта, хутчэй, малітва, якую выконваюць нараспеў падчас каталіцкага богаслужэння. Гучаў грыгарыянскі харал выключна ў мужчынскім аднагалосным выкананні. Немудрагелістыя інтанацыі патрабавалі ад выканаўцаў віртуознага майстэрства. Музычнае развіццё харала, яго свабодную, злёгку манатонную плынь вызначалі асаблівасці тэксту — доўгія і кароткія склады, акцэнты ў словах, паўзы.

«Музычную малітву» выконвалі ў храме засяроджана, без выказвання эмоцый. Склады ў словах моцна расцягваліся, і тэкст малітвы, бывала, губляў сваё значэнне. Толькі інтанацыйны лад харала — то спакойна-сузіральны, то сурова-стрыманы, часам аскетычны — указваў на асноўны сэнс музычнага выказвання. Уздзеянне грыгарыянскага спеву на вернікаў узмацнялася акустыкай храмаў. Іх высокія скляпенні адлюстроўвалі гук, выклікаючы тым самым рэлігійную глыбокую пашану і містычную адлучанасць.

Для запісу грыгарыянскіх песнапенняў была распрацавана адмысловая нотная сістэма. Спецыяльныя знакі — не́ўмы — паказвалі рух мелодыі ўверх або ўніз. Менавіта з неўм пазней сфарміраваліся нотныя знакі. Але, у адрозненне ад сучаснай музычнай натацыі, неўмы мелі форму квадратаў або ромбаў.

Свецкая музыка Сярэдніх вякоў была цесна звязана з рыцарскай культурай. Таленавітыя паэты-музыканты — *трубадуры* і *труве́ры* ў Францыі, *мінезі́нгеры* ў Германіі — выклікалі ў народа вялікую цікавасць. Асноўнай тэмай іх творчасці было каханне рыцара да Прыгожай Дамы. У *песні ранішняй зары* — найбольш распаўсюджаным жанры музычнай творчасці — вандроўныя музыканты расказвалі аб радасных спатканнях героя са сваёй каханай. Песні пакаралі вытанчанасцю і неверагодна мяккай, цякучай мелодыяй. Спевакі вельмі



Музыканты. Мініяцюра з «Вялікага Гейдэльбергскага песенніка», Германія (XIV ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дакладна знаходзілі рыфму, правільнае слова і музычную інтанацыю, апавядаючы пра пачуцці і перажыванні закаханых.

Прачытайце лірычныя творы трубадураў, труавераў і мінезінгераў на дадатковай старонцы. Чым, на ваш погляд, адрозніваецца паэзія французскіх і нямецкіх аўтараў?

**Тэатральныя формы.** Асноўнай формай рэлігійнага тэатра на працягу некалькіх стагоддзяў з'яўлялася драма, якая выконвалася свяшчэннаслужыцелямі пад скляпеннямі храмаў у дні царкоўных свят. Калі тэатралізаваныя прадстаўленні з-за маштабнасці і мноства пастановачных эфектаў сталі адцягваць вернікаў ад службы, дзействы перанеслі на плошчу.

Асаблівай папулярнасцю ў гледачоў карысталіся *міра́клі* — драмы, у якіх шчаслівая развязка наступала дзякуючы ўмяшанню Боскіх сіл. Яскравым прыкладам можа служыць *«Цуд аб Тэафі́ле»* сярэдневяковага аўтара Рутбёфа. Эканом Тэафіл, імкнучыся да ўлады і багацця, заключае здзелку з д'яблам. Пакорлівы і ўважлівы да сваіх блізкіх герой паступова ператвараецца ў бессардэчнага і чэрствага эгаіста. Пазней Тэафіл раскайваецца, але толькі з дапамогай Мадонны ён атрымлівае назад распіску аб продажы душы, і дабрачыннасць бярэ верх.

Яшчэ больш фантастычнай вобразнасці прысутнічала ў *містэ́рыях*. У містэрыяльных дзействах «ажывалі» гісторыі Святога Пісання — ад стварэння свету да Страшнага суда. Іх выконвалі сотні гараджан, прычым кожная рамесная гільдыя дэманстравала ў прадстаўленні свае ўменні і шчодрасць. Напрыклад, пастаноўка эпізоду *«Пакланенне вешчуноў»*, замацаванага за залатых спраў майстрамі, ператваралася ў выстаўку ювелірных вырабаў. У эпізодзе



Містэрыяльная сцэна ў Валансье́не. Мініяцюра (1547 г.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*«Ноеў каўчэг»* суднабудаўнікі на вачах у гледачоў хутка будавалі карабель, у сцэне *«Сусветны патоп»* маглі вызначыцца рыбакі і матросы. Раскошныя касцюмы, рэквізіт, дэманстрацыя зацьменняў, землетрасенняў і грому — усе гэтыя грандыёзныя магчымасці містэрыі ўражвалі ўяўленне гледачоў.

Свецкія матывы выразна праявіліся і ў *фа́рсах* (у перакладзе з лацінскай *farta* — «фарш», «начынне»). Першапачаткова гэтыя кароткія камічна-бытавыя сцэнкі з лаянкамі і бойкамі ўводзіліся ў трагічныя па змесце містэрыяльныя прадстаўленні. У тэкстах містэрый часта пісалі: «Тут уставіць фарс». Але з часам вулічны фарс вылучыўся ў самастойны тэатральны жанр. Так, у самых знакамітых фарсавых прадстаўленнях пра прыгоды збяднелага адваката Патлена або пра двух башмачнікаў ярка паказаны побыт і норавы сярэдневяковага горада.

Прачытайце дадатковую старонку. Падумайце, што прыцягвала майстроў мастацтва пачатку XX стагоддзя ў сярэдневяковых тэатральных формах.

Музычная і тэатральная культура Сярэдневякоўя стала сапраўдным адкрыццём. Рыцарскія турніры, любоў да Прыгожай Дамы, Круглы стол караля Артура ў свецкай культуры; грыгарыянскі спеў у царкоўнай культуры... Тэмы, жанры і вобразы сярэдневяковай эпохі не толькі трывала ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай культуры, але і сталі асновай новых мастацкіх ідэй.

## Пытанні і заданні

1. Праслухайце на кампакт-дыску грыгарыянскія харалы «Ave Maria», «Dies irae». Якое ўражанне ў вас выклікае гэтая музыка? Якія асацыяцыі ўзнікаюць пры яе праслухоўванні? Як вы думаеце, чаму навукоўцы лічаць, што грыгарыянскі спеў глыбока сугучны гатычнай архітэктуры?

2. Разам з неўмамі ў еўрапейскай натацыі з'явіліся і назвы асноўных нот — Ut, Re, Mi, Fa, Sol, La. Як вы бачыце, назва першай ноты адрозніваецца ад звыклай для сучаснага чалавека назвы «До». Даведайцеся і раскажыце ў класе, чаму ў Сярэднія вякі першая нота мела іншую назву, а таксама хто, калі і чаму даў гэтай ноце новае імя.

3. Паразважайце, чаму камічныя фарсавыя сцэнкі ўстаўляліся ў сур'ёзныя містэрыяльныя прадстаўленні з ярка выражаным трагедыйным сюжэтам.

## Творчая майстэрня

4. На працягу многіх стагоддзяў сумная гісторыя пра Трыстана і Ізольду натхняла паэтаў, драматургаў, музыкантаў на стварэнне ўсё новых і новых яе версій. Правядзіце невялікае даследаванне на тэму «Сучасныя інтэрпрэтацыі сюжэта пра Трыстана і Ізольду ў розных відах мастацтва». Пазнаёмцеся з адной з версій. Наколькі адрозніваецца сучаснае прачытанне вядомага сюжэта ад арыгінала?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Паспрабуйце інсцэніраваць урывак з п’есы «Цяперашнія браты», прадстаўлены на дадатковай старонцы. Прыдумайце, якія эмблемы-сімвалы вы будзеце выкарыстоўваць пры стварэнні такіх персанажаў, як Брацкая Любоў і Зайздрасць. Патлумачце свой выбар.

## § 5. Сімвалізм у мастацтве Візантыі

У гісторыі сярэдневяковага хрысціянства вылучаюцца дзве лініі развіцця культуры: Заходняя Еўропа і Візантыя. У адрозненне ад каталіцкай Еўропы, Візантыйская імперыя была апорай праваслаўя. Яе мастацтва адрознівалася кананічнасцю і абстрактнасцю вобразаў — меншай сувяззю з рэальнасцю, асаблівай урачыстасцю і глыбокім сімвалізмам.

**Сімволіка візантыйскага храма.** Калі ў Заходняй Еўропе найбольш распаўсюджаным тыпам храма была базіліка, то ў Візантыі — *крыжова-купальнае збудаванне*. Крыжова-купальная царква ўяўляе ў плане квадрат з упісаным у яго *грэчаскім крыжам* з роўнымі канцамі. Цэнтральную частку такіх храмаў вянчае купал — сімвал неба, прыстанку Бога.

Як і ў базіліцы, апсіда ў крыжова-купальнай царкве звычайна знаходзіцца з усходняга боку. Бо менавіта на ўсходзе ўзыходзіць сонца, якое сімвалізуе Царства Нябеснае. У апсідзе размяшчаецца *алтар з прастолам*, на якім адбываецца галоўнае хрысціянскае таінства — прычашчэнне Святых Дароў, гэта значыць ператварэнне хлеба і віна ў Цела і Кроў Хрыстовы.



Інтэр’ер храма Сан-Вітале ў Равене, Італія (VI ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне